Ігар ШАЛАДОНАЎ

# ЧАСОВАЕ І ВЕЧНАЕ Ў ТВОРАХ ЯКУБА КОЛАСА

Творчасць Якуба Коласа – надзвычайная з'ява ў беларускім прыгожым пісьменстве. Класік беларускай літаратуры рэалізаваўся не толькі як мастак слова, але і як мысляр-філосаф.

Імкненне пісьменніка да высокамастацкага афармлення выказвання магло адбіцца на яснасці перадачы думкі. Мысляр мог увайсці ў канфлікт з мастаком, больш за тое, любы мысляр часта сутыкаецца з прынцыповай неадпаведнасцю ўсякага слоўнага афармлення думкі. Еднасць слова і ідэі, зместу і формы – складаная задача для кожнага пісьменніка, які жадае спалучыць у сабе і мастака, і філосафа.

На нашу думку, паяднаць розныя грані генію Я. Коласу дапамог адзін з асноўных прыродных задаткаў – уменне *мысліць час*. Найперш гэта азначае такую якасць таленту і майстэрства аўтара, калі думка аб часе ў мастацкай прасторы тэксту як бы флукцыруе з самога часу. Магчымасць канцэнтравана мысліць час – гэта і здольнасць творцы арганічна ўтрымліваць у эстэтычнай прасторы зместу не толькі прысутнае, але і тое, чаго ўжо няма, і тое, што яшчэ наступіць.

Менавіта крэатыўнае ўменне па-асабліваму філігранна сінтэзаваць і кампанаваць фізічны, гістарычны і мастацкі час і дазваляе Я. Коласу надаваць часоваму, недаўгавечнаму характар вечнага.

Для беларускага майстра слова вечнасць не абстрактная прастора, дзе застылі ў заўсёдным супакоі імгненні і рэчы свету, як у архіве ці сховішчы. Не, пісьменнік ясна ўсведамляе, што фундаментальная, анталагічная якасць часу – няспынная рухомасць, менавіта таму частым сімвалам часу ў філосафаў розных эпох выступае вобраз плыні, ракі, ручая, таксама вельмі характэрны і для вобразна-сімвалічнай сістэмы беларускага празаіка. Прыгадаем знакаміты коласаўскі верш "Ручэй". Рака, ручэй у дадзеным выпадку сімвалізуе адначасна і зменлівасць, і вечную працягласць.

Зямны чалавек – істота часовая, бо існуе толькі ў часе. Час належыць чалавеку як свайму пачатку. Цікавы філасофскі парадокс быцця: час аказваецца вечнай уласнасцю таго, хто сам смяротны.

У паэтычнай канцэпцыі часу Я. Коласа, з нашага пункту гледжання, вечнай выступае адзіная рыса часу – яго зменлівы характар. Для пісьменніка вечнасць складаецца са шматлікіх момантаў імклівага, больш ці менш недаўгавечнага існавання рэчаў, дзе час вечна распадаецца на фракталы: мінулае, сучаснае і будучае. Так, у адным з алегарычных апавяданняў "Камень" з цыкла "Казкі жыцця" празаік падае вобраз каменя, які стаў аб'ектам абмеркавання шматлікіх суседзяў: рэчкі, лесу, дуба, бусла і інш. Яны лічылі яго стан існавання шчаслівым і радасным, сыходзячыся на думцы: *"Кажуць жа – моцны, як камень, і маўклівы, як камень… Ляжыць сабе, як пан, у мяккім доле"* [1, с. 488].

Шчасце каменя бачылася жыхарам маляўнічага месца не толькі ў камфортным месцазнаходжанні і спагадлівай долі, але яшчэ і ў даўгавечнасці і рэспектабельнасці, усе лічылі камень славутасцю свайго прыгожага кутка. Але адбылася падзея, якая вельмі здзівіла жыхароў наваколля: нечакана шчаслівы камень рассыпаўся: *"І ўсе здзівіліся такому здарэнню. І ніхто не ведаў, што сказаць на гэта. – З чаго ж такое ліха прылучылася з ім?"* [1, с. 488].

Мы лічым, што ў творы падкрэсліваецца думка пра абмежаванасць поглядаў персанажаў – суседзяў каменя – на саму сутнасць існавання кожнай рэчы ў свеце. Усё, што нараджаецца ў часе і прасторы, адначасна трапляе і пад паступовае разбурэнне і знішчэнне, працэс энтрапіі не мае літасці ні да чаго.

Згодна са светапоглядам пісьменніка, вечнасць у дадзеным мастацкім тэксце не выяўляецца ні ў адным з момантаў часу самім па сабе, яна можа быць памыслена толькі ў адносінах да пэўнага моманту рэальнасці, калі ён набывае на пэўна-працяглым часе існавання дамінантную пазіцыю і захоплівае права на вечнасць, а потым пацвярджае гэтае права ў барацьбе з іншымі момантамі часу праз працэс звароту, вяртання.

Чалавек, які гаспадарыць над часам, можа не быць рэччу свету, гэта значыць, ён можа выбіраць і ствараць свой лёс, уплываць на яго і на рух часу ў самім сабе і навакольнай рэчаіснасці. Мы выразна бачым псіхалагічна-мастацкую скіраванасць эстэтычнага самавыяўлення Я. Коласа: вечнасць – несупынны працэс часовага, зменлівага. Таму ўсе яго героі ў вечным руху, заўсёды "на ростанях".

Асаблівая мастацкая ўвага да канкрэтнага, рэальнага, гістарычнага, зменлівага дазваляе творцу найбольш праўдзіва і заклапочана па-

*Звесткі пра аўтара змешчаны ў № 4.*

глыбляцца ва ўнутраны свет герояў, перадаваць дыялектыку іх паводзін і задум. Героі і вобразы Я. Коласа выразна маніфестуюць сваю прыналежнасць да жывога сацыяльнага, гістарычнага і быццёвага моманту гісторыі.

Пошукі коласаўскімі героямі свайго "я" заўсёды адбываюцца ў такой мастацкай плыні часу, якая не можа быць прынесена ў ахвяру спрошчанасці абстрактнай выдуманай схемы ці тэорыі. Час і вопыт – амаль непарыўныя і неадменныя ў мастацкай прасторы нашага класіка. Персанажам Я. Коласа наканавана шукаць сваё "я" зноў і зноў. Галоўныя героі пісьменніка нярэдка апынаюцца ў стане жыццёва-часавай няўстойлівасці і непрадказальнасці праз такія тэмпаральныя якасці: мінулае мае неад'емную рысу – магчымасць яго забыцця, а будучыня валодае здольнасцю да нечаканага змянення абставін і спадзяванняў.

Самаідэнтычнасць, вернасць сабе героі Я. Коласа падтрымліваюць праз высілкі ўспамінаў, праз цярпенне, але не меншых душэўна-энергетычных затрат патрабуе ад іх і працэс змянення ўнутраных установак і знешніх паводзін.

Праз тыя ці іншыя жыццёвыя сітуацыі пісьменніку ўдаецца вельмі аб'ёмна і ёміста выпісаць вобразы сваіх персанажаў у дзейсна-часавым іх выспяванні. Па-майстэрску тонка перадаючы рухі душы герояў, творца, разам з тым, схоплівае і люструе няўлоўныя змены праяў чалавечага быцця, пераход асобы ў новую якасць, на новую ступень.

Самавызначэнне – гэта найперш духоўная праца душы і сэрца ў момант выбару той ці іншай пазіцыі ці лініі паводзін, такі пераход-выбар больш важны, чым працэс паступальнага самаствярэння. У такі момант час набывае найвышэйшую форму самавыяўлення, спосаб прагляду сябе ў перспектыве-вечнасці.

Яскравая ілюстрацыя падобнай экзістэнцыйнай сітуацыі – эпізод з паэмы "Сымон-музыка", калі сялянскі хлапчук Сымонка вымушаны перарваць адносіны з роднымі людзьмі, якія дрэнна разумеюць яго творчую натуру. Каб псіхалагічна праўдзіва перадаць рэфлексію героя, паэт-эпік скарыстоўвае мастацкія прыёмы: алегарычнае адступленне пра промня-неслуха і апісанне летаргічнага сну-прароцтва хлопчыка на могілках.

Летаргічны сон Сымонкі – такое імгненне быцця, калі герой патанае ў жыцці, адчувае звязанасць з усім у свеце і датычнасць да ўсяго. Сон Сымонкі – гэта акно ў вечнасць, не толькі рэалізацыя ўласнага скарбу-вопыту часу, але найперш падключэнне да агульначалавечага і боскага вопыту.

Усе мастацкія прыёмы Я. Коласа скіраваны толькі на тое, каб часавы самарух, час-пачатак біяграфіі героя і яго лёс мелі выразна акрэсленую ідэйную зададзенасць на праблему мастацтва як праяву вечнасці.

Прарочы сон хлопчыка дазваляе яму псіхалагічна разарваць невыносны лінейна-ланцуговы час ранейшага побытавага прыніжанага існавання і ўбачыць больш шырокі далягляд, што і дае яму магчымасць зрабіць крок да ўласнага часу-лёсу, за які ён ужо сам павінен несці адказ. Змяшчэнне часавых каардынат падчас сну – у нейкай меры псіхалагічна-стрэсавы трэнінг, каб зазірнуць у прастору вечнасці і паспрабаваць расчытаць яе сімвалы для сябе. Сымонку гэта ўдалося зрабіць.

Асноўныя героі коласаўскіх твораў Андрэй Лабановіч з рамана "На ростанях", Сцяпан Барута з аповесці "На прасторах жыцця", Сымонка з паэмы "Сымон-музыка", Міхал, Ганна і Антось з паэмы "Новая зямля" і іншыя не статычныя, яны вядуць вечную спрэчку самі з сабой, праяўляючы велізарную моц духу па ўдасканаленні, упрыгожванні і гарманізацыі навакольнай рэчаіснасці, заўсёды імкнуцца глядзець на свет з перспектывы ідэальнай будучыні.

Героі Я. Коласа выяўляюць высокую духоўнасць на шляху няспыннага стварэння чалавекам сябе паводле ідэальнага вобраза – адзіным сапраўдным шляху маральнага ўдасканалення, ачышчэння і ўзвышэння. У штодзённых клопатах пра блізкіх людзей і пра ўладкаванне побыту чалавек, які імкнецца захаваць сваю самасць, кожны раз намагаецца падняцца над мітуснёй і тлумам – не парываючы сувязі з зямным, ён на імгненне трапляе ў далягляды вечнасці.

Так, мара Міхала з "Новай зямлі" прыдбаць кавалак зямлі, каб стаць на ім сапраўдным гаспадаром і гэтым вырвацца з ярма дзяржаўнай службы, у мастацкім часавым вымярэнні мае істотнае значэнне. Уласны надзел зямлі дазваляе прадстаўніку сялянскай цывілізацыі як класічнай, традыцыйнай формы пражывання найбольш поўна трансляваць сябе адначасна ў мінулае і ў будучыню.

Таму зразумела і нязломнае жаданне дробнай шляхты XIX ст. да апошняга трымацца свайго звання і кавалка зямлі – прага захаваць сябе ў гісторыі дзяржавы, Айчыны, у вечнасці.

Час мае здольнасць захоўваць сябе ў досведзе, індывідуальным ці грамадскім. Імкнучыся набыць зямлю, Міхал падсвядома мае на мэце намер перадаць уласны вопыт і вопыт жонкі Ганны і брата Антося ("час-работу") нашчадкам. Вечныя ж пярэбары з месца на месца ствараюць сітуацыю разрыўнасці чалавечага духоўнага патэнцыялу.

Таму, хто не мае ўласнага сакральнага месца ў свеце, хто сэрцам не прыкіпеў да роднага кута, ці знойдзецца месца ў вечнасці, бо час заўсёды імк-

нецца спіхнуць чалавека ў становішча кропкі пачатку, каб даць толькі права на разгортванне лёсу.

Нам думаецца, што эмацыйна-шчымлівы зачын-пачатак паэмы "Новая зямля" нясе ў сабе драматычную энергетыку страты рэальнага гістарычнага часу, які атрымоўвае моц праз успамін: *"Мой родны кут, як ты мне мілы!.. / Забыць цябе не маю сілы!"* [2, с. 7].

У часавай сістэме твораў Я. Коласа значнае месца адводзіцца і матыву супастаўлення жыцця і смерці (Міхал і воўк). Менавіта праз страх смерці для герояў Я. Коласа часта выяўляецца прырода сусветнага часу. На парозе смерці перад Міхалам час раскрывае свой сапраўдны звярыны выгляд – "пажыральніка жыцця" (паводле Гегеля) – і выразна выступае самапараджэннем небыцця, якое можна пераадолець толькі вялікай прагай да жыцця, памножанай на волю чалавека да самаўдасканалення.

Для мастацкага самавыяўлення Якуба Коласа характэрна думка-перакананне, што чалавек можа існаваць толькі думаючы, і найперш ён мусіць мысліць, асэнсоўваць свой час. Не мыслячы, не думаючы, чалавек не выконвае сваё наканаванне, страчвае каштоўнасную і анталагічную сутнасць і прызначэнне ў быцці.

*Прасторны шлях! калі ж, калі*
*Ты закрасуеш на зямлі*
*І злучыш нашы ўсе дарогі?* [2, с. 280].

Знакамітыя фінальныя радкі коласаўскай паэмы "Новая зямля" насычаныя не толькі глыбінным светапоглядным зместам, але і тэмпаральным падтэкстам, дзе праблеме часу адведзена вызначальнае месца. Вось гэтая часавая коласаўская дамінанта *калі ж, калі* назаўсёды акрэсліла для герояў Якуба Коласа і для нас вечны пошук праўды і шчасця жыцця.

**Спіс літаратуры**

1. **Колас, Я.** Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас. – Мінск : Маст. літ., 1973. – Т. 5.

2. **Колас, Я.** Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас. – Мінск : Маст. літ., 1974. – Т. 6.